СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. *Синчук, И. И.* Археологический отчет о проведении раскопок на Мозырском замчище в августе 1988 г. / *И. И. Синчук*. – Минск, 1989 – 54 л., 22 фото, 30 л. рис. // Архив НИИ «Белспецреставрация». – Объект № 159–78. – Инв. № 30.

2. *Синчук, И. И.* Археологические исследования в г. Мозыре в 1988 г. / *И. Синчук* // Гомельщина : Археология, история, памятники. Тезисы Второй Гомельской областной научно-практической конференции по историческому краеведению, 1991 г. Секция археологии и нумизматики. – Гомель, 1991. – С. 63–66.

3. *Зданович, Н. И., Синчук, И. И.* Керамическая бытовая посуда из Мозыря (по материалам раскопок 1988 г.) / *Н. И. Зданович, И. И. Синчук* // Гомельщина : Археология, история, памятники. Тезисы Второй Гомельской областной научно-практической конференции по историческому краеведению, 1991 г. Секция археологии и нумизматики. – Гомель, 1991. – С. 67–68.

4. *Зданович, Н. И., Синчук, И. И.* Керамическая бытовая посуда Мозырского замчища (Беларусь) / *Н. И. Зданович, И. И. Синчук* // Археология и история Пскова и Псковской земли : Семинар имени академика В.В. Седова. Материалы 54 заседания (15–17 апреля 2008 года). – Псков, 2009. – С. 381–393.

5. *Синчук, И.* Стеклянные браслеты из мозырской коллекции 1988 г. / *И. Синчук* // Гістарычна-археалагічны зборнік. – № 18. – Минск, 2003. – С. 191–196.

6. *Григорьев, М., Синчук, И.* Предметы вооружения 10-16 вв. из Мозырского краеведческого музея / *М. Григорьев, И. Синчук* // Гістарычна-археалагічны зборнік. – № 15. – Минск, 2000. – С. 139–144.

***Sintchouk I. I.* Excavations at the Mozyr castle in August 1988**

*In 1988, the expedition of the Research Institute "Belspetsrestavratsiya" carried out archaeological research on the territory of the Mozyr castle, an archaeological monument of the 12-17 centuries. In order to study the cultural layer 2 excavations, 13 pits were was done, and material from 21 geo-wells was involved. A large number of rims of pottery from the time of the castle's existence have been discovered.*

УДК 902/904(476)

***Сінчук І. І., Пачобут Н. А.***

# НУМІЗМАТЫЧНЫЯ І СФРАГІСТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ З РАСКОПАК І НАДЗОРАЎ НА ВУЛІЦЕ ЗАМКАВАЯ Ў Г. ГРОДНА У 2019–2020 гг.

*Артыкул датычыцца археалагічных знаходак пломбы дрогічынскага тыпу, перстня-пячаткі новага часу, монет сярэднявечча, новага і навейшага часу ў гістарычнай частцы г. Гродна ў 2019–2020 гг.*

## Уступ

Пры археалагічных раскопках пад кіраўніцтвам Н. А. Пачобут сезонаў 2019–2020 гг. у г. Гродно па вул. Замкавай, якая адносіцца да гістарычнага цэнтра горада [1], знойдзены звычайныя для гарадскога культурнага слоя некалькі дзесяткаў разрозненых медных солідаў Яна ІІ Казіміра Вазы, 3 грошы Станіслава Аўгуста Панятоўскага, манеты Расійскай імперыі др. пал. 19 ст., першых дзесяцігоддзяў 20 ст., манеты 20 ст. Таварныя пломбы к. 19 – пач. 20 ст. знойдзены па ўсёй плошчы раскопаў 1-4. Некалькі апісаных ніжэй знаходак выдзяляюцца з агульнага шэрагу.

## Асноўная частка

### Пломба драгічынскага тыпу

Пломба драгічынскага тыпу знойдзена металадэтэктарам пры археалагічным наглядзе за будаўнічымі працамі па аб'екце «Адміністрацыйна-камерцыйны аб'ект у раёне дома па вуліцы Замкавай, 12 у Гродне» у 2020 г. Культурны пласт разбураны ў 19 ст. будаўніцтвам цаглянага будынка.



***Мал. 1. Пломба драгічынскага тыпу: аверс і рэверс, прамалёўка тамгі***

Яна мае на адным баку партрэтную выяву, на другім – двухзубец (*мал.* 1). Таўшчыня пломбаў без рэльефных выяваў (знака і твару) – 1,2 мм, разам з рэльефам 1,9–2 мм, вышыня 15,8 мм, шырыня 9,6 мм. Знойдзеныя ў слоі 13 ст. экзэмпляры пломбаў з раскопак 2019 г. Н.А. Кізюкевіч на Старым замку ў Гродне маюць двухзубец таго ж тыпу (скрыжаванне асновы двухзубца публікуемай пломбы часткова разбурана шнурком, адноўленая частка пазначанай адсутнасцю заліўкі-фактуры на прамалёўцы). Гэтая пломба адрозніваецца наяўнасцю малюнка твара.

Аўтахтонныя «люстэркавыя» двухзубцы на берасцейскім туеску 12 ст. са Старога замка ў Гродне [2, мал. 100] калі і маюць падабенства з двухзубцам пломбы, то толькі ілюзорнае. Яны маюць скрыжаванне то на левым, то на правым зубцы, але ў адрозненне ад знака пломбы ў іх на ножцы скрыжаванне адсутнічае і маецца выражаны адрог на супрацьлеглым зубе адносна зуба са скрыжаваннем. Акрамя таго, у Гродне ў Каложскай царкве была выяўлена на плінфе др. пал. 12 ст. тамга, падобная на публікуемую, але ў люстэркавым выглядзе [3, с. 228, мал. 65]. Аднак на тэрыторыі Гродна дагэтуль не знойдзена ні адной загатоўкі для пломбы, што магло б сведчыць пра мясцовае паходжанне пломбаў.

Пломбы са знакам падобным на тамгу друкуемага артэфакта вядомыя з 19 ст., але дагэтуль з імі не суаднесены ніхто з князёў [4, табл. IV, (№ 151а), табл. XV (№ 712), табл. XVII (№ 766, 806), табл. XIX (№ 914), табл. XXI (№ 951); 5, Мал. 64, трэці знізу шэраг, другая і трэцяя злева пломбы; 6, табл. XXV (№ 31); 7, tabl. I (№ 5); 8, с. 151][7].

[7] Аўтары з задавальненнем выказваюць падзяку С.В. Бялецкаму за аператыўную кваліфікаваную дапамогу ў атрыбуцыі знаходкі.

Вось выявы боку з тыгой адхілена на 150 ад восі з выявай твару, што дазваляе здагадвацца аб адсутнасці насімай зафіксаванай штэмпельнай пары, напрыклад, выкарыстанне для пламбавання аднаго замацаванага ў калодзе альбо сталешніцы штэмпеля і ўтрымліваемага ў руцэ другога. Вышыня рэльефа таксама кажа пра выкарыстанне ўдарнага інструмента.

**Пражскі грош**

Пражскі грош Вацлава IV быў знойдзены на глыбіні 3 м у 2019 г. пры раскопках (Раскоп-3). Яго дыяметр 27,6 мм, таўшчыня ад 0,2 мм да 0,5 мм (так!). З-за сістэмнай памылкі ў разліку неабходнай магутнасці ўдарнага штамповачнага абсталявання бок са львом недастаткова выбіты (*мал.* 2), як і ў большасці г.з. «сцёртых» пражскіх грошаў[8].



***Мал. 2. Пражскі грош Вацлава IV.***

Верагодна, манета па класіфікацыі J. Hana адносіцца да тыпу XIV перыяду 1400–1415 гг. [9, s. 175–182]. Даследчыкі адзначаюць: «Використання типології і хронології для празьких грошів тривалого правління Вацлава IV (1378–1419) для монетного матеріалу із східноєвропейських скарбів показало, що тут домінують празькі гроші, карбовані після 1405–1407 рр.» [11, с. 59; 10, с. 66]. Знойдзеная манета цалкам адказвае чаканням і па тыпу ўкладаецца ў гэтыя храналагічныя рамкі.

Адзінкавая знаходка пражскага гроша ў Гродне мае значэнне як яшчэ адзін пункт у тапаграфіі, які паказвае пазначаны знаходкамі апошніх гадоў шлях паступлення грошаў з Польшчы ў басейны рэк Буга і Немана [12, с. 104].

**Персцень-пячатка**

Медны персцень-пячатка з выявай папулярнага сюжэта на літой шкляной устаўцы «Битва орла со змеем над воротами Царьграда» (*мал.* 3) знойдзены

[8] Да захаванасці манеты гэты дэфект адносін не мае.

металадэтэктарам пры археалагічным наглядзе за будаўнічымі працамі па аб'екце «Адміністрацыйна-камерцыйны аб'ект у раёнах дома па вуліцы Замкавай, 12 Гродно» в 2020 г. Ён мае наступныя параметры: 8-кутны шчыток памерам 1,5х1,3х0,7 см (апошняе – таўшчыня); унутраны дыяметр кальца 1,8х1,6 см; сячэнне дротавага кальца плоска-выпуклае – 0,4х0,4 см. Шкляная ўстаўка ўтоплена ў шчыток перстня. Выкарыстаны глухі каст – прасцейшая асноўная форма апраўкі, якая забяспечвае надзейнае замацаванне ўстаўкі.



***Мал. 3. Персцень-пячатка 18–19 стст .: адбітак шчытка, персцень***

Сярод апублікаваных беларускіх асабістых пячатак 16–17 стст. чвэрць (68 з 301) мае форму адбітка ў выглядзе васьмікутніка (прамакутніка з усечанымі кутамі) [13, с. 57–106]. Сярод украінскіх асабістых пячатак 16–17 стст. трэць (280 з 868) мае васьмікутны кшталт [14]. Маюцца васьмікутнага кшталту ўзоры і сярод расійскіх пячатак [15, табл. XII: 50; XIX: 82, 83, 85; XX: 94; XXIII: 117–120; XXIV: 17]. Аналагічны персцень знойдзены ў Валагодскай вобласці РФ на беразе р. Сухона [16].

Тыражнасць уставак-ліцікаў асабістых пячатак можа гаварыць пра патрэбнасці ўладальніка да некаторага сацыяльнага паведамлення, напрыклад, серыйны персцень можа быць карпаратыўным атрыбутам члена цэха, гільдыі або братэрства.

Верагоднае датаванне з улікам палітычнай гісторыі беларускіх зямель і геаграфіяй распаўсюджвання сюжэта – 18–19 стст.

**Манетна-рэчывы скарб**

Манетна-рэчавы скарб без прыкмет упаковачнай тары быў знойдзены ў падвале дома па вуліцы Замкавай, 12 ніжэй за ўзровень падлогі ў 2020 г. Скарб складаецца з трох карманных гадзіннікаў, пары запанак, гузікаў, булавак, спражак, партсігара, буйных і дробных срэбраных манет 17–20 стст. (сярод іх пяць паўтаракаў 1623–1625 гг., тры экзэмпляры рублёў 1816 г., 1829 г., 1834 г., два экзэмпляры 20 кап. 1913 г. і 1914 г., два экз. 15 кап. 1915 г.) Малодшая

датаваная рэч скарба – 2 дынары Каралеўства Сербаў, Харватаў і Славенцаў (серб. Краљевина Срба, Хрвата и Словенаца) 1925 г.

Верагодна, пасля раздзялення спаяных карозіяй рэчаў, ачысткі і дэталёвага вывучэння скарб будзе аднесены да серыі скарбаў Гродзенскага гета перыяду Другой сусветнай вайны.

СПІС ЦЫТАВАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Супрон, М., Шчукін, С.* Гісторыка-архіўныя і бібліяграфічныя даследаванні страчанай гістарычнай забудовы квартала вуліцы Падзамча, Збройнай і ўсходняй часткі вуліцы Замкавай у Гродне / *М. Супрон, С. Шчукін*. – Гродна, 2020. – 145 с. // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://drive.google.com/file/d/122NVipKFbzQ-M97hqj_drLYlwPrmQb0p/view – Дата доступу : 01.09.2020.

2. *Трусаў, А. А., Собаль, В. Е., Здановіч, Н. І.* Стары замак у Гродне XI–XVII стст. / *А. А. Трусаў, В. Е. Собаль, Н. І. Здановіч*. – Мінск, 1993.

3. *Трусаў, А. А.* Эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі манументальнага дойлідства Беларусі XI–XУIII стст. / *А. А. Трусаў*. – Мінск, 2020.

4. *Болсуновский, К. В.* Дрогичинские пломбы. Ч. I. / *К. В. Болсуновский*. – К., 1894.

5. *Лихачев, Н. П.* Материалы для истории русской и византийской сфрагистики. Вып. 2. / *Н. П. Лихачев*. – Л., 1930. – (Труды музея палеографии. Вып. II.)

6. *Лихачев, Н. П.* Сфрагистический альбом // Рукописный отдел Научного архива Института истории материальной культуры РАН. – Ф. 35. – Оп. 2. – Д. 444.

7. *Hanc-Maikowa, E.* Plomby drohiczyńkie zbiorów Muzeum Archeologicznego i Etnograficznego w Łodzi / *E. Hanc-Maikowa* // Prace i materiały Muzeum Archeologicznego i Etnograficznego w Łodzi. Seria numizmatyczna i konserwatorska. – № 8. – 1988.

8. *Белецкий, С. В., Веретюшкин Р. С., Горлов К. В.* Свинцовые пломбы из раскопок в Курске в 2016 г. / *С. В. Белецкий, Р. С. Веретюшкин, К. В Горлов* // Записки Института истории материальной культуры РАН. – Вып. 16. – СПб., 2017.

9. *Hána, J.* Pražské groše Václava IV. z let 1378–1419. / J. Hána. – Plzeň, 2003.

10. *Соболева, Н. А.* К проблеме обращения пражских грошей в русских землях в XIV-XV вв. / *Н. А. Соболева* // Вестник МГУ, 1967. – № 2.

11. *Козубовський, Г. А.* Празькі гроші XIV–XV ст. з археологічних пам'яток України / Г. А. Козубовський // Археологія, 2010. – № 4.

12. *Синчук, И. И., Колединский, Л. В.* Пражские гроши из Слуцка и его округи / *И. И. Синчук, Л. В. Колединский* // Двадцатая Всероссийская нумизматическая конференция. 16–20 апреля 2019 г. – Великий Новгород. Тезисы докладов и сообщений. – М., 2019.

13. *Цітоў, А.* Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі / *А. Цітоў*. – Мінск, 1993.

14. *Алфьоров, О., Однороженко, О.* Українські особові печатки XV-XVII ст.: За матеріалами київських архівосховищ. / *О. Алфьоров, О. Однороженко*. – Харків, 2008.

15. *Станюкович, А. К., Авдеев, А. Г.* Неизвестные памятники русской сфрагистики. Прикладные печати-матрицы XIII-XVIII веков из частных собраний. / *А. К. Станюкович, А. Г. Авдеев*. – М., 2007.

16. «Битва орла со змеем над вратами Царьграда» // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://perstni.com/collection/bitva-nad-tsargradom-4 – Дата доступа : 01.09.2020.

***Sintchouk I. I., Pochobut N. A.* Numismatic and sphragistic materials from excavations and surveillances on zamkova street in the Grodno city in 2019–2020**

*The article concerns archeological finds of Drogichyn-type seals, rings-seals of modern times, coins of the Middle Ages, modern and modern times in the historical part of Grodno in 2019–2020.*